*Мяньчэня С.В.* (*Мінск*)

# РАСПАЎСЮДЖВАННЕ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧЫХ ВЕДАЎ ПРАЗ БЕЛАРУСКІЯ ПЕРЫЯДЫЧНЫЯ ВЫДАННІ КАТАЛІЦКАЙ СКІРАВАНАСЦІ (ПА МАТЭРЫЯЛАХ ГАЗЕТ «BIEŁARUS» (1913–1915) І «KRYNICA» («BIELARUSKAJA KRYNICA») (1920–1937)

З'яўленне беларускай каталіцкай прэсы было абумоўлена шэрагам фактараў. Па-першае, гэта пазіцыя мясцовых дзеячаў касцёла. У 1905 г. віленскі біскуп Эдвард Роп выступіў з ідэяй стварыць асобную газету для беларусаў-каталікоў, аднак яго намеснікі не толькі не падтрымалі гэтую задумку, але і адгаварылі біскупа ад гэтай ідэі [3]. Па-другое, гэтаму садзейнічала актывізацыя беларускага нацыянальнага руху. З'яўленне газеты «Наша Ніва» на некаторы час зняло гэтае пытанне, аднак пасля адмовы рэдакцыі ад лацінкі, яно зноў актуалізавалася. У 1912 г. Антон Бычкоўскі атрымаў дазвол на выданне каталіцкай газеты на беларускай мове лацінкай, аднак рэалізаваць выданне здолеў толькі ў 1913 г. з дапамогай Яна Пазняка (1895–1939), які выдаткаваў сродкі на першыя нумары. Рэдакцыя новай газеты – «Biełarus» («Беларус») – складалася з А. Бычкоўскага (рэдактар), Я. Пазняка, Баляслава Пачобкі (1884–1940) і Антона Лявіцкага (*Ядвігін Ш.*) (1869–1922). А. Бычкоўскі не мог асабіста працаваць у рэдакцыі, таму яго функцыі выконваў Б. Пачобка, які з № 24 за 1913 г. стаў ужо і афіцыйным рэдактарам [3].

Акрамя навін жыцця касцёла, духоўных артыкулаў, тут друкаваліся літаратурныя творы, мясцовая хроніка. З прычыны таго, што мэтавай аўдыторыяй газеты з'яўлялася сялянства, значная ўвага надавалася і сельскагаспадарчай тэматыцы. Ужо ў першым нумары з'яўляецца раздзел «Наша гаспадарка» [4, с. 3]. У раздзеле падаваліся парады ў адпаведнасці з гаспадарчым календаром. Тэматыка гэтых парад прыводзіцца ў табл. 1. Пераважная іх большасць датычылася тэхналогіям апрацоўкі глебы і выкарыстання ўгнаенняў, а таксама гадоўлі кароў і іх харчаванню.

Раздзел з'яўляўся рэгулярна на працягу 1913–1914 гг., адсутнічаў ён толькі ў асобных нумарах, а ў № 37 за 1914 г. выйшаў пад назвай «Суседскія рады» [12, с. 7–8]. У 1915 г. раздзел з'явіўся толькі ў адным нумары, у якасці адказу на запыт чытача [15, с. 7].

**Табліца 1. Сельскагаспадарчыя матэрыялы газеты «Беларус», 1913–1915 (складзена аўтарам паводле Bielarus. – 1913. – №1–39; 1914 – № 1–52; 1915. – №1–30)**

| Тэматыка | 1913 | 1914 | 1915 |
|---|---|---|---|
| жывёлагадоўля | 3 | 9 | – |
| садоўніцтва | 5 | 4 | 1 |
| птушкагадоўля | 1 | 1 | – |
| кармавыя расліны і сенажаці | 8 | 4 | – |
| апрацоўка глебы і ўгнаенні | 11 | 5 | – |
| дагляд сядзібы і гаспадарчыя клопаты | 8 | 7 | – |
| пчалярства | 1 | – | – |

Знікненне сельскагаспадарчых матэрыялаў можна патлумачыць як аб'ектыўнымі прычынамі – актуалізацыя падзей Першай сусветнай вайны; так і суб'ектыўнымі – мабілізацыя некаторых сталых аўтараў. Выкарыстоўваліся таксама матэрыялы іншых выданняў: артыкулы «Лён» і «Каноплі» з газеты «Lud Božy» (1914, № 17, с. 7–8), «Зборка сена» з часопіса «Саха» (1914, № 26, с. 7–8).

Мова сельскагаспадарчых парад «Беларуса» была досыць простая: складаныя сказы і навуковыя тэрміны амаль не ўжываліся. Матэрыял «Пара брацца за сяўбу» (1914, № 32) падаецца ў форме гутаркі: гаворка вядзецца ад першай асобы, утрымлівае шмат зваротаў, прымавак і параўнанняў. Адзін з апошніх матэрыялаў, прысвечаных сельскай гаспадарцы, «Агляд будынкаў на зіму» (1914, № 47) пачынаецца сказам «Надыходзіць бела чарадзейка зіма» і больш падобны на невялікае мастацкае апавяданне.

Сельскагаспадарчыя матэрыялы часцей за ўсё падпісваліся крыптанімамі *L–k* (альбо *Lu–k*, *Lo–nik*) (1913, № 9–10, 14, 16–18, 29–30, 34–35, 39; 1914, № 13–16, 18, 21–23), *Wat–ka* (*W–a*) (1913, № 3, 6, 11–12, 23, 25). Іх матэрыялы датычыліся рознай тэматыкі: ад гадоўлі кароў да садоўніцтва і рэцэптаў смачнага хлеба. Сустракаліся матэрыялы за подпісамі *Haspadar* і *Haspadynia* (1914, № 4, 32, 47, 51). *Haspadynia* давала парады аб тым, як даглядаць кур зімой, бо зімой «яйкі больш каштуюць»: наладзіць разнастайны рацыён, утрымліваць у светлым і сухім месцы, арганізаваць скрыню з пяском, яйкі захоўваць так, каб яны не краналіся адно аднаго ў пяску, зерні ці попеле. Яшчэ адзін матэрыял аўтаркі

датычыўся прыгатавання танных абедаў для сям'і ва ўмовах вайны і дэфіцыту [9, с. 7–8; 14, с. 8]. У пачатку 1914 г. актыўным аўтарам сельскагаспадарчага раздзела «Беларуса» стаў *Язэп Шпэт* (1891–1955), беларускі пісьменнік і фалькларыст, які атрымаў адукацыю ў галіне малочнай вытворчасці, меў досвед практычнай дзейнасці ў якасці аканома, падпісваўся як «практыкант па гадоўлі быдла» [10, с. 7–8]. З пачаткам яго супрацоўніцтва з газетай назіраецца павелічэнне ўвагі да жывёлагадоўлі, а пасля мабілізацыі Шпэта ў дзеючую армію тэматыка змяняецца. Матэрыялы Я. Шпэта ўтрымлівалі парады па арганізацыі даення, гадоўлі цялят, вызначэння ўзросту каровы па зубах і рагах. У адным з іх ён уступае ў палеміку з *L–k* па пытанні ўтрымання кароў. «Дзядька *L–k*» прапаноўваў трымаць іх у агароджы і на некалькі гадзін выпускаць пасвіцца, а Шпэт лічыў, што лепш карову навязваць, а каб ёй было дзе хадзіць, сеяць больш травы і канюшыны [*10*, с. 7–8].

Сярод матэрыялаў розных аўтараў можна адзначыць выкарыстанне тытунёвага настою для апрацоўкі садоў ад шкоднікаў і для мыцця авечак пасля стрыжкі; абсыпанне дрэваў у садзе снегам, каб яны пазней прачнуліся і час квітнення не трапіў пад замаразкі; ужыванне селядцовай поліўкі для барацьбы з кратамі і змочанага ў салёнай вадзе высушанага лісця дрэў на корм жывёле зімой.

Пазіцыя рэдакцыі газеты «Беларус» адносна будучыні Беларусі была сфармулявана наступным чынам: «Каб беларус быў чалавекам, каб быў ён разумным, вучоным, багатым». У артыкуле «Скуль можа прыйсці паляпшэнне нашай долі» сцвярджалася: «Дабрабыт гаспадаркі не залежыць ад колькасці зямлі. Не трэба яе забіраць у паноў і дзяліць між мужыкамі, а мужыкам трэба вучыцца гаспадарыць» [8, с. 7–8]. Гэтая ж канцэпцыя лягла ў аснову апавядання Б. Пачобкі «На малым куску». Галоўны герой – Язэп – пасябраваў з панскім сынам, навучыўся чытаць, асабліва ўпадабаў кнігі па гаспадарцы. Пасля смерці бацькі Язэп пачаў выкарыстоўваць веды на практыцы, стаў заможным гаспадаром і ажаніўся з найбольш працавітай дзяўчынай. Як вынік, Язэп «жыве панам» [11, с. 7–8]. Для паляпшэння гаспадаркі прапаноўвалася арганізаваць сельскагаспадарчыя школы для дарослых, якія будуць вучыцца ў вольны час, а практыку праходзіць на сваёй зямлі. Умовамі карыснасці такой адукацыі лічылі дапушчэнне да выкладання мясцовых жыхароў і забеспячэнне выкладання на роднай мове [4, с. 6]. Ухвалялася

арганізацыя хутароў, сялянская кааперацыя, пераход ад састарэлай трохпольнай сістэмы да шматполля, прапагандавалася травасеянне, садоўніцтва. Дапамагчы наладзіць гаспадарку павінна было і развіццё прадпрымальніцкіх здольнасцей. Артыкул з гаворкай назвай «Час – гэта грошы» заклікаў кожнага гаспадара займацца рамяслом, быць добрым гандляром [5, с. 1–2].

Галоўнымі праблемамі сялянскай гаспадаркі і прычынамі яе заняпаду лічыліся гультайства, п’янства і міграцыя. У артыкуле «Нашае нараканне» прапаноўвалася па магчымасці абмежаваць выезд у Амерыку [6, с. 1]. Пра маштабы міграцыі пісала «Наша Ніва». Так, у 1912 г. толькі праз порт у Лібаве (суч. – Ліепая, Латвія) у Амерыку выехала 58 507 чал., з іх 21 791 (37 %) – жыхары Віленскай, Віцебскай, Гродзенскай, Магілёўскай і Мінскай губерняў. На Гродзеншчыну прыходзілася 7 018 чалавек, ці 12 % ад агульнай колькасці мігрантаў, на Міншчыну – 8 320, ці 14 % [2, с. 288]. Улічваючы розніцу колькасці насельніцтва губерняў і іх памер, у заходняй частцы Беларусі гэты працэс усё ж больш быў заўважным для эканомікі.

Некаторыя сельскагаспадарчыя выданні «Беларус» выкарыстоўваў у якасці падарункаў для сваіх падпісчыкаў. З № 1 за 1914 г. чытачы атрымалі «Беларускі каляндар» [7, с. 1]. Тым хто аформіць падпіску на 1914 г., абяцалі даслаць кнігу «Pčalina – żywiolka malaja, a karysci daje mnoha», выдадзеную ў 1911 г. у Пецярбургу [13, с. 4]. Аўтарам яе быў выпускнік Рыма-каталіцкай духоўнай акадэміі Генрык Бэта (1886–1965) (псеўданім – *Henryk Bierozko*). Пры жаданні кнігу можна было набыць, звярнуўшыся ў рэдакцыю. З Велікодным нумарам газеты за 1914 г. кніга была даслана ўсім падпісчыкам «Беларуса», але гэты нумар быў канфіскаваны ўладамі, і толькі, калі судовая палата адмяніла гэтае рашэнне, кніга ўсё ж трапіла да чытачоў [1, с. 229].

Пасля захопу Вільні летам 1915 г. нямецкімі войскамі выданне газеты «Беларус» прыпынілася, а намаганні Б. Пачобкі аднавіць яго не атрымалі падтрымкі, перш за ўсё фінансавай [3]. У пэўнай ступені традыцыі «Беларуса» працягнула заснаваная ў 1917 г. газета «Крыніца»(«Krynica»), першым рэдактарам якой стаў Адам Станкевіч (1891–1949). «Крыніца» (у 1925–1937 гг. «Bielaruskaja Krynica») з’яўлялася партыйным выданнем Беларускай хрысціянскай дэмакратыі (БХД), таму назваць яе каталіцкім

выданнем можна толькі ўмоўна. У адрозненні ад «Беларуса» «Крыніца» была грамадска-палітычным свецкім выданнем, дзе рэлігійная тэма абмяжоўвалася навінамі і пытаннямі беларусізацыі касцёла і царкоўнай уніі, але ў той жа час некаторыя дзеячы БХД (А. Станкевіч, Я. Пазняк) былі раней датычны да выдання «Беларуса». Да 1930 г. газета друкавалася выключна беларускай лацінкай, пасля – лацінкай і кірыліцай.

Сельскагаспадарчы раздзел з'яўляецца тут толькі ў 1920 г., ён прысутнічае толькі ў двух з 16 нумароў. Перыядычнасць з'яўлення сельскагаспадарчых матэрыялаў у наступныя гады падаецца ў табліцы 2. Пры падліку не ўлічваліся канфіскаваныя нумары, бо рэдакцыя дубліравала іх з улікам цэнзуры: наступны нумар змяшчаў матэрыялы папярэдняга, на месцы забароненага артыкула была белая паласа. Так, напрыклад, артыкул «Больш увагі працы зімой» быў змешчаны ў № 50–52 за 1928 г., пры гэтым да чытачоў дайшоў толькі № 52 [18, с. 2]. У 1925 г. сельскагаспадарчыя матэрыялы сустракаюцца ў 13 нумарах «Крыніцы» і ў адным «Беларускай крыніцы». Раздзел некалькі разоў змяняў сваю назву: «Крыху аб гаспадарцы» (1920), «Аб гаспадарцы» (1923), «Гутаркі аб гаспадарцы» (1924), «Аб гаспадарцы» (1927).

**Табліца 2. Перыядычнасць публікацыі сельскагаспадарчых матэрыялаў у газеце «Крыніца» («Беларуская крыніца») (1920–1937)**

| Год | 1920 | 1921 | 1922 | 1923 | 1924 | 1925 | 1926 | 1927 | 1928 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Колькасць нумароў | 2 | 18 | – | 7 | 28 | 13+1 | 8 | 49 | 34 |
| Год | 1929 | 1930 | 1931 | 1932 | 1933 | 1934 | 1935 | 1936 | 1937 |
| Колькасць нумароў | 25 | 14 | 28 | 13 | 2 | – | – | – | 1 |

Як і ў «Беларусе», частка матэрыялаў «Крыніцы» была падпісана псеўданімамі і крыптанімамі. Часцей за ўсё тут сустракаецца подпіс *Haspadar*. У 1923–1926 гг. з газетай супрацоўнічаў *А. Кавалёў* (псеўданім Адольфа Клімовіча), матэрыялы якога датычыліся разнастайных сфер – ад конегадоўлі да правілаў захавання бульбы. Матэрыялы, падпісаныя ініцыяламі *J.P.*, найбольш верагодна належаць *Яну Пачопку* (1890–1977) – беларускаму рэлігійнаму і культурнаму дзеячу, блізкаму сябру мастака Язэпа Драздо-

віча [27; 28]. Я. Пачопка меў сельскагаспадарчую адукацыю, да пачатку Першай Сусветнай вайны служыў у Дэпартаменце земляробства Віленскай губерні, супрацоўнічаў з часопісам «Саха». Ён з'яўляецца аўтарам наступных выданняў: «Малочная карова: Як яе выбраць, карміць і даглядаць» (1923), «Пчолы і як вадзіць іх у рамавых вуллях» (1923), «Гародніцтва: Як трэба гаспадарыць на гародзе, каб мець добрае варыва» (1925), «Як выбраць добрага каня» (1928), ілюстрацыі да якіх зрабіў Я. Драздовіч. Уліваючы плённую працу Я. Пачопкі ў галіне распаўсюджвання сельскагаспадарчых ведаў, можна меркаваць, што яго супрацоўніцтва з «Крыніцай» магло быць больш актыўным.

У 1927 г. *Адольф Клімовіч* (1900–1970) на той час студэнт Інстытута сельскай і лясной гаспадаркі Чэшскага тэхнічнага ўніверсітэта і кіраўнік аддзела міжнародных зносін Аб'яднання беларускіх студэнцкіх арганізацый, пачынае дасылаць матэрыялы ў сельскагаспадарчы раздзел ужо пад сваім сапраўдным прозвішчам. З № 15 А. Клімовіч распачаў цыкл «Культура поля», які з'яўляўся адаптаваным для сялян вучэбным курсам па тэхналогіі апрацоўкі глебы. Як пазначаў сам аўтар, мэтай цыкла было «падаць матэрыял даступна і падрыхтаваць чытача да чытання адмысловай літаратуры» [17, с. 2]. З № 48 распачаўся цыкл, прысвечаны жывёлагадоўлі і кармавым раслінам, які працягнуўся на наступны год. У снежні 1928 г. А. Клімовіч вярнуўся ў Вільню, а з пачатку 1929 г. узначаліў сельскагаспадарчы аддзел «Крыніцы». Быў анансаваны і новы падыход: парады чытачам, якія даслалі свае запыты ў рэдакцыю, але такая практыка пратрымалася толькі некалькі месяцаў [19, с. 2]. У 1932 г. А. Клімовіч стаў рэдактарам каапературна-гаспадарчага часопіса «Самапомач» (1932–1939), што, у сваю чаргу, прывяло да скарачэння колькасці сельскагаспадарчых матэрыялаў на старонках «Беларускай крыніцы». Апошнія матэрыялы А. Клімовіча «Соя» і «Цукровы сіроп замест цукру» былі надрукаваны ў 1933 г. [23, с. 3; 24, с. 4]. І хоць у далейшым публікацый ужо не было, супрацоўніцтва з «Беларускай крыніцай» працягнулася. Кніга А. Клімовіча «Земляробская чытанка» дасылалася чытачам у якасці падарунка за гадавую падпіску на 1934 г. [25, с. 2].

Тэматыка сельскагаспадарчых матэрыялаў «Крыніцы» адпавядала спецыялізацыі сельскай гаспадаркі Беларусі – мяса-малочная вытворчасць (дагляд за жывёлай і кармавыя расліны) і

земляробства (тэхніка апрацоўкі глебы і ўгнаенні). Сярод новых форм гаспадарання прапаноўвалася звярнуць увагу на рыбагадоўлю. Друкаваліся парады аб тым, як зрабіць і зарыбіць ставок, назіраць за ім, у якасці прамысловых відаў прапаноўваліся шчупакі і карпы [21, с. 4]. Прапагандавалася ідэя развіцця хутарскіх гаспадарак і кааперацыі. У якасці прыкладаў даводзілася інфармацыя аб паспяховых кааператывах. Як напрыклад, малачарны кааператыў у м. Вялікая Ліпа (суч. – Нясвіжскі раён). Створаны ў снежні 1931 г. кааператыў праз год аб'ядноўваў 196 гаспадароў і 312 кароў. Мелася свая малочная крама ў Баранавічах, бібліятэка, інструменты, практыкавалася сумеснае страхаванне жывёлы [22, с. 4].

Цікавасць выклікае і артыкул «Дождж ці пагода?», прысвечаны назіранням за надвор'ем і народным прыметам. За ўсе гады выдання гэта адзіны падобны матэрыял, а народная культура тут сутыкаецца з навуковым прагрэсам. Аб набліжэнні дажджу павінны быў папярэдзіць гук далёкага цягніка, а чытачам прапаноўвалі зрабіць уласны «барометр», змясціўшы жабку ў шкляную пасудзіну з вадой і драбінкай [20, с. 4].

«Крыніца» таксама актыўна выкарыстоўвала матэрыялы іншых выданняў. На працягу 1920–1921 гг. большасць сельскагаспадарчых матэрыялаў ці падаюцца са спасылкай на часопіс «Саха» (№ 13–14 (1920), № 3-4, 7–8 (1921)), ці за подпісам яго аўтараў – агранома *М. В-п* («Каза – кароўка бедака»), спецыяліста па конегадоўлі *А. Сініцкага* («Як каваць коней»). Наступны раз матэрыялы «Сахі» будуць выкарыстаны толькі ў 1927 г. – «Як абясшкодзіць бадлівасць кароў» і «Дагляд птушак»(№ 47), «Дапамога хворай жывёле» (№ 50). Не заставаліся без увагі і дасягненні беларускай савецкай аграрнай навукі. У 1925 г. тут друкуюцца матэрыялы з «Савецкай Беларусі» – «Час падумаць аб серадэлі» (№ 14–15), «Выкарыстоўвайце курыны гной» (№ 16), «Беларусы-пчаляры» (№ 24), «Паляпшэнне гаспадаркі» (№ 31), у 1929 г. матэрыял з навукова-папулярнага часопіса «Плуг» «Аб карысці попелу» (№ 3). Першы пасля 1933 г. і апошні матэрыял прысвечаны сельскагаспадарчым ведам на старонках «Беларускай крыніцы» «Як прыгатавацца да ранняга выседжвання куранят» (1937, № 1) меў спасылку на польскае выданне «Tygodnik Rolniczy».

У 1934 г. адбылася спроба наладзіць супрацоўніцтва «Беларускай крыніцы» з таварыствам «Пчала». Былі анансаваны завочныя курсы па тэме «Арганізацыя збору мядова-лекавых зёлак», змешчы-

на некалькі аб'яў аб куплі зёлак у чытачоў, аднак працягу гэтая тэма не атрымала, а «Пчала» засяродзілася на выданні часопіса «Беларуская борць» (1934–1938) [26, с. 4].

Як грамадска-палітычнае выданне «Крыніца» крытыкавала аграрную палітыку польскай дзяржавы. Так, асадніцтва называлася не інакш як «нягодныя планы польскай палітыкі» [16, с. 1]. Працэсы калектывізацыі ў БССР таксама не выклікалі аптымізму ў рэдакцыі («Калгасныя гаспадаркі без коней», № 16, 1931), больш станоўча ацэньвалася аграрная палітыка Літоўскай рэспублікі, бо яе экспартная скіраванасць абумоўлівала стварэнне сістэмы кантролю за якасцю прадукцыі і стымулявала павышэнне прадукцыйнасці працы [24, с. 3].

Перыядычныя выданні беларускай лацінкай «Беларус» і «Крыніца» былі разлічаны перш за ўсё на мясцовае каталіцкае насельніцтва. Тэма сельскай гаспадаркі і распаўсюджвання сельскагаспадарчых ведаў не была для іх асноўнай, але перыядычна сустракалася на іх старонках. Дабрабыт сялян, як эканамічная аснова нацыянальнага Адраджэння, звязваўся з пашырэннем асветы, новымі формамі гаспадарання і кааперацыяй. Змест такіх матэрыялаў эвалюцыяніраваў ад простых парад да навуковых тэкстаў, што можна звязаць з некаторым павышэннем адукацыйнага ўзроўня мэтавай аўдыторыі. Выкарыстоўваліся публікацыі як арыгінальныя, так і іншых беларускіх выданняў, асобныя беларускія выданні на сельскагаспадарчую тэматыку распаўсюджваліся ў якасці падарункаў для падпісчыкаў. Перыядычнасць з'яўлення сельскагаспадарчых матэрыялаў залежыла як ад аб'ектыўных (сацыяльна-палітычныя працэсы, абмежаванасць па колькасці старонак), так і суб'ектыўных фактараў (час супрацоўніцтва асобных аўтараў з рэдакцыямі адзначаўся павелічэннем актыўнасці). Свой унёсак у распаўсюджванне сельскагаспадарчых ведаў праз адзначаныя выданні зрабілі вядомыя беларускія дзеячы – Я. Шпэт, Я. Пачопка, А. Клімовіч; а таксама іншыя асобы, імёны якіх яшчэ патрабуюць ідэнтыфікацыі.

## ЛІТАРАТУРА

1. **Мяньчэня, С. В.** Ксёндз Генрык Бэта як папулярызатар беларускага пчалярства / С. В. Мяньчэня // Сельское хозяйство Беларуси сквозь призму научных исследований : докл. II Междунар. науч. конф., приуроч. к 95-летию Нац. акад. наук Беларуси, Минск, 29 сент. 2023 г. / Нац. акад. наук Беларуси, Белорус. с.-х. б-ка им. И. С. Лупиновича, Ин-т истории,

Науч. совет по кн. культуре, книгоизданию и б-кам Междунар. ассоц. акад. наук ; редкол.: Ю. О. Каракулько (отв. ред.) [и др.]. – Минск, 2023. – С. 225–230.

2. **Мяньчэня, С. В.** Папулярызацыя сельскагаспадарчых ведаў і ацэнка стану і перспектыў сельскай гаспадаркі Беларусі на старонках «Нашай Нівы» (1906–1915) // С. В. Мяньчэня // Научные труды Республиканского института высшей школы. – Вып. 23, ч. 1 : Исторические науки. – Минск : РИВШ, 2023. – С. 283–290.

3. **Пачобка, Б.** «Беларус». З успамінаў рэдактара / Баляслаў Пачобка // Наша Слова. – 2020. – 18 сакавіка. – С. 8.

4. **Bielarus.** – 1913. – № 1.
5. **Bielarus.** – 1913. – № 4.
6. **Bielarus.** – 1913. – № 8.
7. **Bielarus.** – 1914. – № 1.
8. **Bielarus.** – 1914. – № 2.
9. **Bielarus.** – 1914. – № 4.
10. **Bielarus.** – 1914. – № 25.
11. **Bielarus.** – 1914. – № 27.
12. **Bielarus.** – 1914. – № 37.
13. **Bielarus.** – 1914. – № 39.
14. **Bielarus.** – 1914. – № 51.
15. **Bielarus.** – 1915. – № 23–24.
16. **Bielaruskaja** kryniса. – 1926. – № 3.
17. **Bielaruskaja** kryniса. – 1927. – № 15.
18. **Bielaruskaja** kryniса. – 1928. – № 52.
19. **Bielaruskaja** kryniса. – 1929. – № 2.
20. **Bielaruskaja** kryniса. – 1931. – № 24.
21. **Bielaruskaja** kryniса. – 1931. – № 33.
22. **Bielaruskaja** kryniса. – 1932. – № 10.
23. **Bielaruskaja** kryniса. – 1933. – № 18.
24. **Bielaruskaja** kryniса. – 1933. – № 36.
25. **Bielaruskaja** kryniса. – 1934. – № 3.
26. **Bielaruskaja** kryniса. – 1934. – № 20.
27. **J. P.** Jak mieć rannjuju bulbu / J. P. // Bielaruskaja kryniса. – 1926 № 14. – S. 5–6.
28. **J. P.** Wjasnowyja raboty ŭ garodzie / J. P. // Bielaruskaja kryniса 1926. – № 14. – S. 7.

*Рассматривается распространение сельскохозяйственных знаний белорусскими периодическими изданиями «Беларус» (1913–1915) и «Крыніца» (1917–1938), которые издавались белорусами*

*латиницей и были ориентированы на местное католическое население. Автор анализирует вопросы периодичности публикации таких материалов, их содержания и стилистики, проблему идентификации авторов статей, а также публикационную активность некоторых деятелей белорусского национального движения. Основное содержание сельскохозяйственных рубрик, рассматриваемых изданий, было направлено на распространение научной информации, развитие новых форм хозяйствования и кооперации, как экономической основы национального возрождения.*

*The article is devoted to the dissemination of agricultural knowledge by the Belarusian periodicals «Bielarus» (1913–1915) and «Krynica» (1917–1938), which were published in Belarusian Latin script and were targeted at the local Catholic population. The author considers the issues of publication frequency of such materials, their content and style, the problem of identifying the authors of articles as well as the publication activity of some figures of the Belarusian national movement. The main content of the agricultural sections of these periodicals was aimed at disseminating scientific information, developing new forms of management and cooperation as an economic basis for national revival.*

Артыкул паступіў у рэдакцыю 18.06.2025

***Титовец Е.И.*** *(г. Минск)*

## ИСЧЕЗАЮЩАЯ ПАМЯТЬ: ИСТОРИЯ ЭКЗЕМПЛЯРА «ПСАЛТИРЬ РИФМОТВОРНАЯ» СИМЕОНА ПОЛОЦКОГО (1680)

Стихотворное переложение «Псалтири царя и пророка Давида» великого белорусского и русского просветителя-гуманиста Симеона Полоцкого является одной из жемчужин коллекции Центральной научной библиотеки им. Якуба Коласа Национальной академии наук Беларуси (ЦНБ НАН Беларуси). Почти 50 лет книга, поступившая в академическую библиотеку в 1975 г., была единственной в государственных хранилищах Республики, но в 2023 г.